Асартымент вырабаў пашырыўся (біклагі, талеркі і інш.), у аздабленні выкарыстоўвалі штамп. Посуд 1-й пал. 17 ст. аздаблялі белым ангобным пакрыццём, палівай зялёнага, рудога, карычневага колераў.

*А. А. Трусаў, У. В. Угрыновіч.*

**ЛІДСКІ ЗАМАК,** помнік абарончага дойлідства 14—15 ст. Пабудаваны ў 1330-я г. ў Лідзе. Уваходзіў у лінію крапасных умацаванняў Навагрудак — Крэва — Мядзінінкай — Тракай. У збудаваннях Л. з. спалучаюцца рысы раманскай архітэктуры і готыкі (характар суадносін аб'ёмаў, паўцыркульныя і стральчатыя праёмы брам і байніц). Пастаўлены на насыпным пясчаным узгорку (выш. 5—6 м), быў абкружаны балоцістымі берагамі рэк Лідзея і Каменка і ровам з Пн (шыр. каля 20 м), які злучаў рэкі і аддзяляў замак ад горада. Пазней (відаць, у 16—17 ст.) у сістэму перадзамкавых умацаванняў з У уключана штучнае возера. Л. з. у плане няправільны чатырохвугольнік (бакі каля 80 м) з 2 вуглавымі вежамі.

Асноўнае абарончае значэнне мелі пастаўленыя на невысокім падмурку (70—80 см) сцены (таўшчынёй унізе 2 м, зверху — 1,5, выш. да 15 м). Верхняя частка сцен з баявой галерэяй і байніцамі (3,3 м адна ад адной) вымуравана з цэглы. Вонкавыя паверхні сцен з вял. валуноў, прамежкі паміж якімі запоўнены каменнымі клінамі, забутоўка з дробных камянёў, муроўка арміравана драўлянымі бэлькамі. Адначасова са сценамі ў 1-й пал. 14 ст. пабудавана квадратная ў плане (9×9 м) паўд.-зах. вежа. Паўн.-ўсх. вежа, пабудаваная ў канцы 14— пач. 15 ст., мела арачны ўваход з боку двара і лесвіцу. Вежы накрыты шатровымі дахамі і не выступаюць за перыметр сцен. У замак вялі 3 уваходы: 2 у ўсх. і 1 у паўд. сценах. На тэр. Л. з. знаходзіліся праваслаўная царква (у 1533 перанесена ў горад), жылыя і гасп. пабудовы. Жылыя памяшканні былі на верхніх паверхах вежаў. На працягу 14—18 ст. у выніку шматлікіх асад разбураны вежы і ўнутраныя пабудовы, зберагліся рэшткі абарончых сцен і вежаў (у 1-й чвэрці 20 ст. зроблена частковая кансервацыя, у 1982 — поўная). Праводзяцца работы па рэстаўрацыі сцен і вежаў (арх. С. Багласаў, 1977). Ахоўваецца дзяржавай. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Архітэктура, Ліда*, у арт. *Байніца, Вялікае княства Літоўскае*.

*Літ.:* Багласов С. Г., Трусов О. А. Историко-архитектурные исследования и реставрация Лидского замка.— Вопросы архитектуры Литовской ССР, 1981, т. 7, в. 2; Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII — XVIII стст.— Мн., 1979, с. 28—34; Трусаў А. А. Архітэктурна-археалагічнае даследаванне Лідскага замка.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1979, № 4.

*С. Г. Багласаў, А. А. Трусаў.*

**ЛІДСКІ ІОСІФАЎСКІ КАСЦЁЛ ПІЯРАЎ,** помнік архітэктуры канца 18 — 1-й пал. 19 ст. Пабудаваны ў 1797—1825 у Лідзе ў стылі класіцызму. Мураваны храм-ратонда накрыты паўсферычным купалам, завершаным 8-гранным ліхтаром. Да асн. круглага ў плане аб'ёму прылягаюць больш нізкія прамавугольныя ў плане аб'ёмы: па восі У—З — прытвор з 4-калонным порцікам на гал. фасадзе і 2-павярховая сакрысція, з Пд і Пн — невял. рызаліты.



Лідскі Іосіфаўскі касцёл піяраў.

У дэкоры фасадаў выкарыстаны дарычны ордэр. Порцік і рызаліты ўвенчаны трохвугольнымі франтонамі. Вокны прамавугольныя. Унутры па перыметры залы размешчана 8 пар дарычных калон. Будынак абсталяваны пад планетарый. Побач з ім размешчаны мураваныя 1-павярховы корпус кляштара піяраў і 1-ярусная званіца. *А. А. Ярашэвіч.*

**ЛІДСКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ.** Адкрыты 24.4.1959 у Лідзе. Мае 14 экспазіцыйных залаў (пл. экспазіцыі 317 м²), 14,2 тыс. экспанатаў асн. фонду (1985). Аддзелы: прыроды, гісторыі дасав. перыяду, гісторыі сав. грамадства. На стэндах прылады працы каменнага веку, манеты з археал. раскопак на тэр. *Лідскага замка*, зброя розных часоў, дакументы і матэ-





Лідскі замак. Акварэль І. Пешкі канца 18 ст. (злева), фрагмент сцяны (здымак канца 19 ст.).

РЕПОЗИТОРИЙ